**РАШЭННЕ**
**па скарзе на адмову ў рэгістрацыі**
**выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар”**

28 сакавіка 2026 года г. Варшава

Выбарчая камісія ў складзе Алены Прыходзька (Старшыні), Яраслава Бекіша, Алены Жылачкінай, Пятра Маркелава і Дзмітрыя Фурманава (далей — Камісія), разглядзеўшы скаргу, дасланую 26 сакавіка 2026 года з боку выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” ад імя Алісы Рыжычэнка,

**ВЫЗНАЧЫЛА:**

У сваёй скарзе заяўнік сцвярджае, што рашэнне Камісіі ад 24 сакавіка 2026 года аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб'екта «Фракцыя 'Еўрапейскі выбар'» з’яўляецца неправамерным. Згодна са скаргай, Камісіяй дапушчана памылка ў даце (замест панядзелка 23-га сакавіка ўказваецца панядзелак 21-га сакавіка) і не ўлічана тая абставіна, што 17 сакавіка 2026 года з боку Камісіі было накіравана “пацверджанне прыняцця спіса і кода для рэгістрацыі”. Акрамя таго, на думку заяўніка, Камісіяй не разгледжаны “Запыт аб рэгістрацыі”, накіраваны 23 сакавіка 2026 года, чым парушаны “прынцып належнай працэдуры і пп. 4.7.2 Палажэння”.

Заяўнікам адзначана, што накіраванае 21 сакавіка 2026 года патрабаванне Камісіі аб прывядзенні спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта ў адпаведнасць з Палажэннем было немагчыма рэалізаваць з наступных прычын: 1) адкліканне жанчыны са спісу прынцыпова непрымальнае для выбарчага суб’екта, яно супярэчыць мэце ўвядзення гендарнай квоты і парушае пп. 1.2 п.1 Палажэння; 2) пошук новага кандадата-мужчыны за такі кароткі тэрмін невыканальны праз спецыфіку дзейнасці выбарчага суб’екта, паколькі “Фракцыя “Еўрапейскі выбар” з’уляецца аб’яднаннем экспертаў і прафесіяналаў. У скарзе таксама сцвярджаецца, што двухдзённы тэрмін з’яўляецца недастатковым для прыняцця рашэння аб далучэнні да спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта, паколькі патрабуе час на ацэнку рызык рэпрэсій.

Заяўнік сцвярджае, што выбыццё кандыдата са спіса выбарчага суб’екта пасля падачы першасных дакументаў з’яўляецца форс-мажорнай сітуацыяй, у сувязі з чым рашэнне Камісіі не адпавядае “прынцыпам справядлівасці і суразмернасці, абавязковым для Камісіі згодна з пп. 4.7.2”. У скарзе сцвярджаецца, што рашэнне Камісіі прымалася без разгляду магчымасці зніжэння гендарнай квоты да 20%, замены кандыдата ў парадку пп. 7.2 п.7

Палажэння, разгляду заяў і скаргаў у парадку пп. 4.9.5 п.4 Палажэння, і "гэта парушае патрабаванні абгрунтаванасці рашэнняў і прынцып празрыстасці (пп. 4.7.4 Палажэння)".

Заяўнік просіць адмяніць рашэнне Камісіі, разглядзець "Запыт аб рэгістрацыі ад 23 сакавіка па сутнасці і даць на яго афіцыйны адказ", зарэгістраваць выбарчы суб'ект "Спіс 'Еўрапейскі выбар' у складзе 16 кандыдатаў" або "прымяніць механіхм, прадугледжаны п. 7.2 Палажэння, і дазволіць выбарчаму суб'екту ўключыць у спіс новага кандыдата-мужчыну замест таго, хто выбыў, у тэрмін, не менш за 10 дзен з моманту атрымання афицыйнага адказа на гытыю Апеляцыю». У выпадку адмовы ў задавальненні скаргі заяўнік просіць накіраваць афіцыйнае рашэнне з абгрунтаваннем адхілення кожнага аргумента скаргі.

Прааналізаваўшы дакументы і звесткі, дасланыя выбарчым суб'ектам, зварот Алісы Рыжычэнка ад 23 сакавіка 2026 года, а таксама матэрыялы афіцыйнага ліставання і палажэнні нарматыўных актаў, Камісія прыходзіць да наступных высноваў.

**<u>1. Абставіны, звязаныя з рэгістрацыяй выбарчага суб'екта.</u>**

<u>1.1. Храналогія.</u>

11 сакавіка 2026 года ў 01:21:15 па мінскім часе ў Выбарчую камісію паступілі звесткі і дакументы для рэгістрацыі выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" і ўдзелу апошняга ў выбарах у Каардынацыйную раду IV склікання.

Пры аналізе пададзеных звестак і дакументаў выявілася, што патрабаванне Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду (далей - Палажэнне), прадугледжанае падпунктам 3.2.3 пункта 3, не было выканана, а менавіта: ў спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта не забяспечана гендарная квота на ўзроўні не менш 40% асобаў менш прадстаўленага полу ад агульнай колькасці чальцоў спіса.

Так, згодна з дасланымі звесткамі спіс кандыдатаў выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" утрымліваў 8 жанчын і 5 мужчын. Адпаведна, менш прадстаўленым полам з'яўляліся мужчыны і іх адносная колькасць у спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта павінна была складаць не менш за 40 адсоткаў ад агульнай колькасці кандыдатаў спіса. Аднак у працэнтным вылічэнні колькасць мужчын складала 38,46 % (5 : 13 х 100 %), што парушала патрабаванні да ўдзельнікаў выбараў.

З гэтай прычыны выбарчаму суб'екту 11 сакавіка 2026 года было прапанавана ў тэрмін 2 дзён выправіць хібы ў пададзеных на рэгістрацыю выбарчага суб'екта звестках.

12 сакавіка 2026 года паведамленне аб неабходнасці выпраўлення хібаў было паўторна выслана на адрас выбарчага суб'екта з прычыны няўпэўненасці ў дасыланні ліста непасрэдна адрасату і неўказанні ў копіі ліста ад 11 сакавіка 2026 года прадстаўніка выбарчага суб'екта Валерыя Мацкевіча. З улікам паўторнага дасылання паведамлення выбарчаму суб'екту тэрмін выпраўлення хібаў быў падоўжаны да 16 сакавіка 2026 года.

16 сакавіка 2026 года ў 13:30 у Камісію паступіў новы спіс кандыдатаў выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” у складзе 17 асобаў, сярод якіх 7 мужчыны і 10 жанчын.

17 сакавіка 2026 года Камісія даслала на адрас выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” спасылку на гугл-форму для яе запаўнення кандыдатамі спіса ў мэтах выканання патрабаванняў Палажэння (пп. 6.1.6, 6.1.7). Таксама для запаўнення кандыдатамі спіса выбарчага суб’екта быў дасланы код унікальнай ідэнтыфікацыі выбарчага суб’екта з пазнакай пра тое, што яго неабходна ўказаць у адпаведным полі гугл-формы. У паведамленні змяшчалася просьба забяспечыць запаўненне гугл-формы ўсімі кандыдатамі спіса да 24:00 20 сакавіка 2026 года.

20 сакавіка 2026 года ад выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” атрымана паведамленне, што кандыдат пад нумарам 9 (у сапраўднасці пад нумарам 10) не ўдзельнічае ў выбарчай кампаніі. На 20 сакавіка 2026 года дадзеныя для верыфікацыі ўказанай асобы дасланы не былі, як і адсутнічала яе згода на ўдзел у выбарах і падпісаны Мемарандум. Фактычна спіс выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” утрымліваў 16 кандыдатаў, з якіх толькі 6 складалі мужчыны і 10 — жанчыны.

21 сакавіка 2026 года Камісія паведаміла выбарчаму суб’екту “Фракцыя “Еўрапейскі выбар” аб невыкананні патрабавання да гендарнай квоты і дала час на прывядзенне спісу кандыдатаў у адпаведнасць з Палажэннем да панядзелка 23 сакавіка (ў тэксце ліста памылкова ўказана “да панядзелка 21 сакавіка ўключна”).

23 сакавіка 2026 года ад кандыдата выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” Алісы Рыжычэнка паступіў зварот аб пераглядзе нормы Палажэння датычна гендарных квот. Зварот не ўтрымліваў просьбу знізіць квоту або дадаць ці выключыць кандыдата спіса.

24 сакавіка 2026 года Камісія прыняла рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” і накіравала апошняму рашэнне.

<u>1.2. Сцвярджэнне пра накіраванне поўнага пакета дакументаў 16 сакавіка 2026 года.</u>

На момант 16 сакавіка 2020 года выбарчым суб’ектам “Фракцыя “Еўрапейскі выбар” не былі накіраваны наступныя звесткі, што патрабуюцца ў адпаведнасці з Палажэннем:

- згода ўсіх кандыдатаў спіса выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” на ўдзел у выбарах у Каардынацыйную раду (пп. 3.2.3 п. 3 Палажэння);
- пісьмовая згода ўсіх кандыдатаў спіса выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” з палажэннямі Мемарандума аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі (пп. 3.2.5 п. 3 Палажэння);
- копіі дакументаў, якія пацвярджаюць асобу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” (пп. 5.1 п. 5 Палажэння);
- кантактная інфармацыя кандыдатаў, якая дазволіць Камісіі правесці выбарачную (ці поўную) верыфікацыю сапраўднасці пададзеных дакументаў (пп. 6.1.6 п. 6 Палажэння).

Пры такіх абставінах сцвярджэнне пра дасыланне “поўнага пакета дакументаў” не адпавядае рэчаіснасці. Палажэнне не дазваляе ажыццяўляць рэгістрацыю выбарчага суб’екта без пералічаных вышэй звестак і дакументаў.

1.3. Тэзіс пра накіраванне Камісіяй “пацвярджэння прыняцця спіса і кода для рэгістрацыі”.

Дадзенае сцвярджэнне не адпавядае рэчаіснасці. Рэгістрацыя выбарчага суб’екта ў адпаведнасці з Палажэннем адбываецца пасля дасылання ўсіх дакументаў, у тым ліку пералічаных падпунктам вышэй. Рэгістрацыя выбарчага суб’екта ажыццяўляецца адпаведным рашэннем Камісіі. Такога рашэння не прымалася ў дачыненні да выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар”.

Што тычыцца сцвярджэння пра дасыланне “кода для рэгістрацыі”, заяўнікам няправільна перададзена фармулёўка і сэнс дасланага кода: у паведамленні Камісіі ад 17 сакавіка 2026 года выразна адзначана, каб кожны кандыдат спіса выбарчага суб’екта пры запаўненні гугл-формы у адпаведным полі пазначыў “код унікальнай ідэнтыфікацыі выбарчага суб’екта”. Ніякага рэгістрацыйнага нумару выбарчаму суб’екту не надавалася, а сама рэгістрацыя не магла адбыцца праз недасыланне выбарчым суб’ектам дакументаў і звестак, пералічаных вышэй.

1.4. Сцвярджэнне пра дапушчаную памылку ў даце (23 сакавіка).

Дадзенае сцвярджэнне слушнае, сапраўды ў ліставанні Камісіяй дапушчана памылка: замест тэкста “да панядзелка 23 сакавіка” ўказана “да панядзелка 21 сакавіка”.

Дадзеная памылка носіць тэхнічны характар і не магла стварыць негатыўных наступстваў для выбарчага суб’екта. Рэгламентам працы Выбарчай камісіі, абавязковым для выбарчага суб’екта, прадугледжаны правілы адліку тэрмінаў, згодна з каторымі, пры выпаданні тэрміну на выходны дзень ён падаўжаецца да бліжэйшага працоўнага дня ўключна. Таму незалежна ад таго, які б тэрмін указала Камісія – 19 сакавіка (субота), 21 сакавіка (субота) або 21 сакавіка (панядзелак) – апошнім днём тэрміна ўсё адно лічыцца панядзелак 23 сакавіка 2026 года.

Выбарчы суб’ект, у сваю чаргу, не патлумачыў, якім чынам няправільнае ўказанне лічбы апошняга дня тэрміна для выпраўлення хібаў паўплывала на яго дзеянні і не звяртаўся за растлумачэннем. З гэтай прычыны, Камісія прыходзіць да высновы, што дапушчаная тэхнічная памылка з указаннем лічбы даты не з’яўляецца падставай для аспрэчвання правамернасці прынятага рашэння аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб’екта.

**2. Аргументы аб неправамернасці рашэння Камісіі.**

2.1. “Запыт аб рэгістрацыі ад 23 сакавіка быў пададзены ў срок і не разгледжаны”

Заяўнік сврджае, што прыняцце 24 сакавіка 2026 года Камісіяй рашэння да разгляду звароту, накіраванага 23 саквіка 2026 года, парушае прынцып належнай працэдуры і пп. 4.7.2 п. 4 Палажэння.

Паняцце “*прынцып належнай працэдуры*” Камісіі невядомы, прынамсі, ён не прадугледжаны ні Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду, ні міжароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў.

Што тычыцца згаданага ў скарзе прынцыпу “бесстароннасці” Камісіі (пп. 4.7.2 п. 4 Палажэння), заяўнік не патлумачыў, чым менавіта ён парушаецца. Па меркаванні Камісіі, прыняцце рашэння аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб’екта да разгляду зварота не супярэчыць бесстароннасці, а наадварот, адпавядае дзеянням, што патрабуюцца ад яе паводле пп. 6.4, 6.5 п.6 Палажэння.

<u>2.2. “Памылковы тэрмін з боку Камісіі не можа ствараць адмоўных наступстваў для выбарчага суб'екта”.</u>

Камісія цалкам пагаджаецца з дадзенай высновай: ад няправільнага ўказання лічбы ў даце апошняга дня тэрміну для выпраўлення хібаў шкодных наступстваў для выбарчага суб’екта не наступіла і наступіць не магло.

Што тычыцца «*стандартаў справядлівага адміністравання*», якія згадваюцца ў аргументацыі скаргі, то такія стандарты не прадугледжаны ні Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду, ні міжароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў.

Што тычыцца згаданага ў скарзе прынцыпу “бесстароннасці” Камісіі (пп. 4.7.2 п. 4 Палажэння), заяўнік не патлумачыў, чым менавіта ён парушаецца. Па меркаванні Камісіі, памылковы адлік тэрмінаў і бесстароннасць з’яўляюцца несуадноснымі рэчамі.

<u>2.3. “Парушэнне прынцыпу бесстароннасці і надлежнай працэдуры (пп. 4.7.2 Палажэння)”.</u>

Заяўнік сцвярджае, што прыняцце рашэння Камісіі аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб’екта да моманту разгляда зварота парушае прынцып бесстароннасці і “надлежнай працэдуры”.

Палажэннем прадугледжаны парад дзеянняў і тэрміны прыняцця рашэнняў у дачыненні да выбарчага суб’екта, у дакументах і звестках каторага ўтрымліваюцца хібы. Пры гэтым Палажэнне не прадугледжаны абавязак Камісіі прыпыніць разгляд пытання аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб’екта да моманту разгляда зварота.

Камісіяй быў дадзены тэрмін на выпраўленне хібаў, які адпавядае Палажэнню. Выбарчы суб’ект “Фракцыя “Еўрапейскі выбар” не выканаў патрабаванні Палажэння ў тэрмін. Дасланы зварот, у якім не ўтрымлівалася просьба знізіць гендарную квоту або выключыць са спісу ці ўключыць у яго кандыдата(ў) для выканання гендарнай квоты, не з’уляўся абставінай, якая мае прававое значэнне для прыняцця Камісіяй рашэння ў адпаведнасці Палажэннем.

<u>2.4. “Фармальная магчымасць замены кандыдата была нерэалізавальнай на практыцы (п. 7.2 Палажэння)”.</u>

Заяўнік сцвярджае, што з улікам спецыфікі дзейнасці выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” выканаць патрабаванне Палажэння было немагчыма.

Камісія не пагаджаецца з такім аргументам, паколькі выбарчым суб’ектам у скарзе не прыведзена пераканальных аб тым сцвярджэнняў. Палажэнне не

прадугледжвае спецыфіку дзейнасці выбарчага суб’екта ў якасці падставы для падаўжэння тэрмінаў для выпраўлення хібаў у пададзеных на рэгістрацыю звестках і дакументах.

Што тычыцца аргумента аб немагчымасці выпраўлення хібаў у кароткі тэрмін праз неабходнасць патэнцыйнага кандыдата ўзважыць рызыкі рэпрэсій — гэтыя абставіны датычацца кожнага ўдзельніка выбараў і выбарчы суб’ект “Фракцыя “Еўрапейскі выбар” не з’яўляецца выключным. Палажэнне аб выбарах ад 20 студзеня 2026 года прымалася дэлегатамі Каардынацыйнай рады III-га склікання, у дачыненні да якіх наступілі наступствы, пра якія указваецца ў скарзе, што сведчыць пра ўлік дадзеных рызык.

<u>2.5. Форс-мажорны характар узніклай неадпаведнасці.</u>

Апісаны ў скарзе выпадак не з’яўляецца форс-мажорным, што пацвярджаецца самім зместам Палажэння, які прадугледжвае дадзеную сітуацыю і парадак дзеянняў Камісіі і выбарчых суб’ектаў.

<u>2.6. Непрапарцыянальнасць захаду адмовы ў рэгістрацыі.</u>

Заяўнікам сцвярджаецца, што Рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі было прынята без разгляду магчымасці зніжэння гендарнай квоты да 20%, замены кандыдата ў парадку пп. 7.2 п.7 Палажэння, разгляду заяў і скаргаў у парадку пп. 4.9.5 п.4 Палажэння, і “гэта парушае патрабаванні абгрунтаванасці рашэнняў і прынцып празрыстасці (пп. 4.7.4 Палажэння)”.

Абгрунтавання, якім чынам дадзеныя абставіны парушаюць прынцып празрастасці, заяўнікам не выкладзена. Па меркаванні Камсіі, прынцып празрыстасці не мае дачынення да ўказаных акалічнасцяў, што вынікае са зместу пп. 4.7.4 п. 4 Палажэння.

Ад заяўніка не паступала заява аб зніжэнні гендарнай квоты і не прыводзілася абгрунтаванне такой неабходнасці. Камісія не мае права па сваім ўгледжанні прымаць такія рашэнні згодна з пп. 3.2.4 п. 3 Палажэння.

Ад заяўніка не паступала заява аб замене кандыдата ў парадку пп. 7.2 п.7 Палажэння. Акрамя таго, дадзеная норма прымяняльная толькі да выбарчых суб’ектаў, які былі зарэгістраваны рашэннем Камісіі, а не знаходзяцца ў працэсе рэгістрацыі.

Тэзіс пра разгляд заяваў і скаргаў не раскрыты заяўнікам, што не дазваляе зразумець сэнс аргументацыі.

З улікам вышэй выкладзенага, Камісія прыходзіць да высновы аб правамернасці прыняцця рашэння ад 24 сакавіка 2026 года аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб'екта «Фракцыя 'Еўрапейскі выбар'». Кіруючыся пп.4.9.5. п. 4 Палажэння, п. 16 Рэгламента працы Выбарчай камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання”, Камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

У задавальненні скаргі, пададзенай выбарчым суб’ектам «Фракцыя 'Еўрапейскі выбар'» на рашэнне Камісіі ад 24 сакавіка 2026 года аб адмове ў рэгістрацыі выбарчага суб'екта «Фракцыя 'Еўрапейскі выбар'» - адмовіць.

**Старшыня Выбарчай Камісіі** **Алена Прыходзька**